імпрэзы

# На спатканне з паэзіяй

**Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі арганізавалі цыкл сустрэч «Літаратурны алімп Беларусі» з лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі і заслужанымі дзеячамі культуры.**

Знакава, што цыкл распачынаецца ў год, калі Саюз пісьменнікаў Беларусі святкуе 90-годдзе з дня заснавання. Сустрэчы будуць праходзіць кожны месяц. Чытачы Нацыянальнай бібліятэкі змогуць пазнаёміцца з вядомымі сучаснымі беларускімі пісьменнікамі, з іх творамі. У праграме вечароў — яркае мастацкае слова, абмен думкамі пра вечныя тэмы і каштоўнасці: любоў да жыцця, да роднай зямлі і блізкіх людзей, вера ў лепшае. Сустрэчы будуць суправаджацца музычнымі кампазіцыямі ў выкананні сапраўдных майстроў аўтарскай песні.



*Выступае Тамара Краснова-Гусачэнка.*

Першае мерапрыемства ў межах цыкла прайшло з удзелам вядомай беларускай пісьменніцы Тамары Красновай-Гусачэнка.

Сустрэчу адкрыла першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах:

— Усіх нас сёння сабрала слова паэтычнае. І яно будзе гучаць з вуснаў самога аўтара. Сёння распачынаецца вялікі праект, адкрываецца ў Нацыянальнай бібліятэцы — галоўным кніжным храме краіны. Тут будзе яшчэ шмат сустрэч, таму што сучасная беларуская літаратура сапраўды ўзбагачаецца знакамітымі імёнамі. Сёння мне вельмі прыемна, што гэты вялікі творчы праект пачынаецца з вядомай паэтэсы, якая нарадзілася ў Расіі, але душой прырасла да Беларусі.

Паэзія Тамары Красновай-Гусачэнка кранае душу, прымушае думаць, суперажываць, хваляваццa… На творчай сустрэчы можна было пачуць любімыя творы паэтэсы. Акрамя пісьменніцы ў чытаннях прымалі ўдзел сябры і родныя творцы — Дар'я Краснова-Сіліванава і Кірыл Сіліванаў. У фінале сустрэчы чытачоў чакалі музычныя кампазіцыі ў выкананні Вікторыі Лабкоўскай.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**